**Свята "Дзяржаўныя сімвалы маёй Радзімы" для дзяцей старшай групы (5–7 гадоў)**

**Наталія Віктараўна Жулінская,**
выхавальнік дашкольнай адукацыі
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
дзіцячага сада № 12 Навагрудка

**Дзеці дашкольнага ўзросту павінны ведаць і паважаць дзяржаўную сімволіку сваёй краіны. Прадстаўлены сцэнарый можа быць выкарыстаны педагогамі для правядзення свята Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.**

**Свята "Дзяржаўныя сімвалы маёй Радзімы" для дзяцей старшай групы (5–7 гадоў)**

**Задачы:** фарміраваць уяўленні аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь: Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь; элементах Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, якія адлюстроўваюць непаўторнасць і багацці культурных традыцый, побыту і прыроды Беларусі, Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь; выхоўваць пачуццё любові да Радзімы.

**Матэрыялы і абсталяванне:** Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь; маленькія сцяжкі для кожнага дзіцяці; мінусавая фанаграма песні «Зямля мая азёрная», словы М.С. Галіноўскай, музыка М.Д. Галкінай; фанаграма беларускай народнай мелодыі «Крыжачок»; аўдыязапіс Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь; музычны цэнтр; мультыборд; разрэзаныя карцінкі да гульні «Збяры сцяг»; набор картак з выявай гербаў (гарадоў Гродзенскай вобласці).

**Папярэдняя праца:** гутарка з дзецьмі аб дзяржаўнай сімволіцы, разглядванне Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба, слуханне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, чытанне вершаў пра Беларусь, выраб аплікацыі «Наш сцяг».

**Ход мерапрыемства**

*Пад урачысты марш святочна апранутыя дзеці праходзяць у залу. У руках трымаюць сцяжкі.*

**Выхавальнік (В).** Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі! Сёння наша краіна адзначае выдатную ўрачыстую дату – Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь!

Сёння ў Дзень сцяга, герба, гімна
Сабраліся ў зале мы: ты і я,
Пад беларускім сцягам
Усе мы – дружная сям'я!

**В**. Усе краіны свету, усе дзяржавы, якія існуюць на зямлі, маюць свае дзяржаўныя сцягі, дзяржаўныя гімны і дзяржаўныя гербы. Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб нашай Беларусі – сімвалы адзінства і незалежнасці нашага народа. Дзяржаўны сцяг падымаецца падчас урачыстых мерапрыемстваў, святаў, і ў гэты час заўсёды гучыць гімн Беларусі – гэта галоўная песня нашай краіны. Сёння свята Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўны гімна і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. Паслухаем Дзяржаўны гімн нашай рэспублікі!

**Гучыць гімн Беларусі.** *(Усе слухаюць гімн стоячы, спяваюць разам.)*

*На экране – Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.*

**В.** Беларускі сцяг-трохкаляровы, гэта значыць чырвоны, зялёны, белы. Кожны колер мае сваё значэнне. Дзеці раскажуць, што азначаюць колеры Дзяржаўнага сцяга і ўзор арнаменту.

**1-е дзіця**. Чырвоны колер – знак сонца, ён сімвалізуе сілу, мужнасць, багацце і шчаслівае жыццё.

**2-е дзіця**. Для беларусаў гэта яшчэ і колер сцягоў Чырвонай Арміі і брыгад беларускіх партызан, якія вызвалялі нашу зямлю ад ворагаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

**3-е дзіця.** Зялёны колер – гэта сімвал прыроды, колер палёў, лугоў, лясоў. Гэта колер дабра, дабрабыту, міру.

**4-е дзіця**. Белы колер – колер свабоды, чысціні, мудрасці.

**5-е дзіця**. Наш сцяг упрыгожаны арнаментам з геаметрычных фігур. Гэты ўзор называецца «ўзыходзячае сонца».

**6-е дзіця.** Вялікі ромб азначае засеянае поле, а крыж ўнутры яго сімвалізуе сонца. Гэты зварот да вышэйшых сілаў прыроды: узыдзі, сонца, сагрэй зямельку нашу, дай нам добры ўраджай. Будзе багаты ўраджай – будзе што есці і чым засеяць поле ў наступным годзе.

**7-е дзіця**. Парныя ромбы азначаюць жыта, а значыць, і працяг жыцця, працяг роду. Можна сказаць, што тры палоскі і арнамент на беларускім сцягу нясуць грамадзянам Беларусі і ўсім народам зямлі пажаданне дабра, поспеху і працвітання.

**В**. А зараз дзеці прачытаюць вершы пра сцяг Беларусі.

**1-е дзіця.**
Чырвоны, белы і зялёны...
Колер для нас – родны, знаёмы,
Трохкаляровы наш, любімы сцяг,
Беларусі сінявокай знак!
**2-е дзіця**.
Чырвоны – у памяць усіх загінуўшых,
За нашу зямлю, кроў праліўшых,
За гэтак жаданую свабоду,
За славу свайго народа!
**3-е дзіця.**
Зялёны – паказчык жыцця,
Прыроды шчодрыя багацці,
Бо наша прырода і руплівая ніва,
Пра мір і пра згоду спяваюць шчасліва.
**4-е дзіця.**
Белы колер – мудрасць і свабода,
Чысціня душы народа,
Гасціннасць і духоўнасць,
Што складае наш гонар!
**5-е дзіця.**
Арнамент, быццам нітачкі жыцця,
Трымаюць сувязь розных пакаленняў.
Дзе праца, дабрабыт, багацце,
Каб людзі нашы жылі ў шчасці.
**6-е дзіця.**
Вось такі наш слаўны сцяг,
Пра яго мы ўсё знаем!
Сцяг, як норма жыцця
Мы пад ім – адна сям’я!
(*Дзеці ставяць усе сцяжкі ў вазу.)*
**Гульня «Збяры сцяг»** *(разрэзаныя карцінкі)*
*Дзеці складаюць выяву сцяга Беларусі.*

**В**. А зараз давайце ўспомнім яшчэ пра адзін дзяржаўны сімвал Рэспублікі Беларусь – Дзяржаўны герб.

Паглядзіце на Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь *(на экране)*.

У промнях узыходзячага сонца мы бачым контуры тэрыторыі Беларусі. Сонца асвятляе нашу краіну, саграве яе, нясе цяпло, жыццё і радасць. Спрадвеку сонца і зямля лічыліся сімваламі жыцця. Малюнак зямнога шара

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

азначае, што мы жадаем міру ўсім краінам, хочам сябраваць і супрацоўнічаць з імі. Беларусы – мірныя людзі. Але калі хто-небудзь парушыць нашы межы, мы з дапамогай арміі будзем абараняць іх. Напамінам пра гэта служыць чырвоная зорка. Менавіта такія зоркі былі на пілотках салдат, якія мужна змагаліся за перамогу ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

**1-е дзіця.**

Вылучае ён цудоўнае святло.
Да яго – высокая павага,
І, напэўна, у цэлым свеце няма
Высакародней нашага герба.

**2-е дзіця.**

Не грывасты леў і не арол,
І не рыцар, ускінуўшы клінок,
Ранішняга сонца арэол,
З каласкоў і кветачак вянок.

**3-е дзіця.**

Хлеб – аснова жыцця,
Ну а канюшына і васількі…
З гэтай прыгажосці ўсе вякі
На Купалле дзяўчаты ўюць вянкі!

**4-е дзіця.**

І як гэты герб, з года ў год,
Погляд лашчыць, душу весяліць,
Хай цвіце, каб у шчасці жыў народ,
Нашай беларускай зямлі!

**В.** Дзеці, герб таксама ёсць у кожнага горада.

У нашага роднага горада таксама ёсць свой герб.

**Гульня «Знайдзі герб Навагрудка»**

На стале размешчаны малюнкі з гербамі гарадоў Гродзенскай вобласці.

Дзеці разглядваюць і знаходзяць герб Навагрудка.

**В.** Дзеці, а зараз прапаную пагуляць у гульню.

**Гульня «Будзь уважлівы»**

Дзеці стаяць у коле, выхавальнік прамаўляе розныя словы. Калі ён называе тое, што намалявана на гербе Беларусі, дзеці пляскаюць у ладкі, калі не – прысядаюць.

**В.** Малайцы дзеці, вы вельмі ўважлівыя.

**В.** Дарагія дзеці, сімвалы беларускай дзяржавы – гэта наша адметная рыса для ўсяго свету і прадмет нашага гонару. Паважаць сімвалы дзяржавы – значыць паважаць сваю краіну, свой народ, сваю гісторыю.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Сёння свята адзначаем, давайце дружна патанцуем!

**Танец «Крыжачок»**

**В.** Зараз хлопчыкі і дзяўчынкі пра сваю Радзіму праспяваюць песню

**Песня «Зямля мая азёрная».**

**В.** Наша свята скончылася.

Сваю Радзіму, дзеці, любіце.
Заўсёды яе вы беражыце,
Бо лепш няма краю, чым Беларусь.
Ганарыцеся ёю, а я заўжды ёй ганаруся!

## Літаратура


1. Войшнис, О. Государственные символы Республики Беларусь / О.Войшнис // Пралеска.– 2021.– № 12. – С.24–26
2. Штук, Р. Три главных символа моей страны / Р. Штук // Пралеска. – 2022. – № 1. – С.34–37.


ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА